# IV рэгіянальнае свята-конкурс вышыўкі і ткацтва паясоў "Умельцы"

## СЦЭНАРЫЙ

## IV РЭГІЯНАЛЬНАГА СВЯТА–КОНКУРСУ МАЙСТРОЎ ВЫШЫЎКІ І ПЛЯЦЕННЯ ПАЯСОЎ "УМЕЛЬЦЫ"

**29 ЧЭРВЕНЯ 2013 г.**

**11.00 УЗДА**

*(Уздоўж зяленай зоны гарадского стадыена афармлена выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, персанальныя выставы майстроў вышыўкі і пляцення паясоў з 14 раёнаў Мінскай вобласці.)*





*(Гучыць беларуская музыка. Госці знаёмяцца з выставай)*

**<u>УРАЧЫСТАЕ АДКРЫЦЦЁ</u>**

**ВЯДУЧАЯ:** Добрыя людзі, спяшайцеся,
Да нас на свята збірайцеся!
Настрой будзе – лепш не трэба,
Усё знойдзеш для патрэбы!

**ВЯДУЧЫ:** Са Старых Дарог, Стоўбцоў і Капыля
Майстры прыехалі да нас
З Любані, Узды і Чэрвеня…
І кожны – справы сваёй ас!

**ВЯДУЧЫ:** Добры дзень, паважаныя нашы госці, сябры!

Традыцыйна наша Уздзеншчына збірае майстроў ткацтва, вышыўкі і пляцення паясоў з Мінскай вобласці.

Таленавітая, пявучая Уздзенская зямля вітае ўсіх майстроў, гасцей і сяброў!

**ВЯДУЧАЯ:** Упершыню ў 2007 годзе ў Уздзе прайшло другое рэгіянальнае свята-конкурс майстроў вышыўкі і пляцення паясоў "Умельцы" і традыцыйна прыжылося на нашай зямлі.

Наш край сапраўды багаты на таленавітых і працавітых людзей. Тут, ля вытокаў Нёмана, нарадзіліся яны, пайшлі ў свет, каб у розных сферах жыцця славіць свой маляўнічы край.

**ВЯДУЧЫ:** Тут, на месцы старадаўніх паселішчаў, у так званым "салаўіным кутку" Беларусі, на радзіме многіх майстроў пяра, сцэны, мастацтваў, мы рады вітаць удзельнікаў IV рэгіянальнага свята-конкурсу майстроў вышыўкі і пляцення паясоў "Умельцы".

**Слова для віншавання прадстаўляецца намесніку старшыні Узденскага раённага выканаўчага камітэта Яўгену Аляксандравічу Шкелю.**

**ВЯДУЧАЯ:**

А зараз мы запрашаем на сцэну гасцей і членаў журы:

Сахута Яўген Міхайлавіч - старшыня Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці

Рудніцкая Галіна Рэмаўна – член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці

Хачкова Вольга Барысаўна – галоўны спецыяліст па промыслам і рамествам Мінскага абласнога Цэнтра народнай творчасці

Кандраценя Марыя Рыгораўна – галоўны мастак Мінскага абласнога Цэнтра народнай творчасці

Аўтушкова Святлана Аляксандраўна – метадыст Уздзенскага РЦК

*(Журы выходзяць на сцэну, дзяўчына у беларускім аддзенні уручае каравай старшыні журы )*

**ВЯДУЧАЯ:**

*Са збожжа краявідаў Уздзенскай зямлі*
*Майстрыхі гэты каравай спяклі.*
*У караваі рук цяплынь, пяшчота сэрцаў*
*Для паважанага журы*
*І усіх майстроў-умельцаў,*
*Што фарбы з навакольнае красы*
*Уплялі ўзорам у паясы.*

*(Уручэнне каравая)*




**НАКАЗ УДЗЕЛЬНІКАМ АД**

**ЯЎГЕНА МІХАЙЛАВІЧА САХУТЫ**

*Шаноўныя, дарагія людзі!*

*Вітаю вас, нашы шаноўныя ўздзенцы, гаспадары гэтага куточка зямлі, вітаю вас, нашы шаноўныя майстры і майстрыхі, на IV свяце, якое стала ўжо традыцыйным, так, як стала традыцыйным свята ткацтва ў Старых дарогах, разьбяроў у Мядзелі, лыжкароў у Бярэзіно, ганчарства ў Івянцы.*

*І гэта выдатна. Вы "прыХватызавалі" :)) вялікую значную дзялянку народнай мастацкай культуры, трымайце яе, нікому не аддавайце, гэта вельмі цікавая галіна нашай культуры.*

*Прадоўжвайце, развівайце і на сваей зямлі, прыцягвайце ўсю абласць сюды, і не толькі вобласць, думаю, што ў яго будзе больш шырокі маштаб.*

*Вельмі прыемна бачыць такі вялікі, як ніколі, атрад, амаль 80 удзельнікаў.*

*Мы выязджалі сення з Мінска - суцэльны дождж, прыязджаем да паварота на Узду - таксама дождж, пад'язжаем да Узды - суцэльны дождж, думаем, дзе ж яны, бедныя майстры і майстрыхі размесцяцца.. Прыехалі на месца, а тут, бацыце, проста цудоўна. Значыць нам спрыяюць і Бог, і прырода.*

*Наша журы сваю справу ведае, пастараемся ацаніць па меры магчымасці, майстэрства кожнага і кожнай з вас, і кожнаму, кожнай з вас аддаць належнае.*

*Са святам вас!*

**ВЯДУЧЫ:** Шаноўныя майстры, госці, сябры!

На нашым свяце вас чакае сустрэча з "народнымі" калектывамі мастацкай самадзейнасці Узденскага раёна:

"народным"ансамблем народнай песні "Зборная субота";

"народным" ансамблем народнай песні "Суседкі" Кухцічскага СДК,

а таксама ансамблем народнай песні "Дольніца" Горкаўскага СДК Стаўбцоўскага раёна.

**ВЯДУЧАЯ:** Ствараць для вас добры настрой, спрыяць вашай творчай дзейнасці таксама будзе ансамбль "Прасніца" Каралёўскага СДК.

**ВЯДУЧЫ:** Поспехаў вам у творчасці, задуманных мэт, прыгожых вырабаў і, безумоўна, стаць пераможцамі IV рэгіянальнага свята-конкурсу майстроў вышыўкі і пляцення паясоў "Умельцы"!

**ВЯДУЧАЯ:** У добры шлях, майстры-умельцы,
Каб наш раён вам прыглянуўся,
Вам дапамогуць бог і сонца,
Ствараць тут славу Беларусі!

**ВЯДУЧЫ:** Каб любавалася замежжа,
На творчасць нашага народу.
Каб захапляліся бязмежна,
Работай нашых рук заўсёды!

**ВЯДУЧАЯ:** А цяпер, калі ласка, майстры, займіце свае працоўныя месцы.

*(Пачынаецца конкурс, а на галоўнай сцэне прапануецца вялікі канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці раёна з найменнем "народны".)*

---

29 чэрвеня 2013 года ў г.Узда Мінскай вобласці адбылося IV рэгіянальнае свята-конкурс вышыўкі і ткацтва паясоў "Умельцы".

У гэты дзень 90 майстроў і іх вучняў з 13 раёнаў Мінскай вобласці сустрэліся на святочнай пляцоўцы, што размясцілася на гарадскім стадыёне.

Чаго там толькі не было! Ручнікі, сурвэткі, падушкі, абрусы, вышытыя традыцыйнымі тэхнікамі набора, чырвоным і чорным крыжыкам, яскравай маляўнічай гладдзю; дэкаратыўныя пано з пейзажамі і казачнымі сюжэтамі, пярэстыя паяскі, выплеценыя ці сатканыя з рознакаляровых нітак, і паласатыя, і ўзорастыя, з кутасамі і пампонамі.

Гран-пры на свяце-конкурсе ўзялі дзве майстрыхі: па вышыўцы – Святлана Шчэрбач, кіраўнік "народнага" клуба майстроў "Сузор'е" Уздзенскага РЦК, па паясах – Святлана Адзінец, майстар Закальнецкага СДК Любанскага раёна.




Тамара Аксёнчык, таксама з Любанскага раёна, стала лаўрэатам у намінацыі "Лепшая хатняя калекцыя паясоў". Такія паяскі ў даўніну дзяўчаты рыхтавалі ў вялікай колькасці. Усюды яны былі патрэбныя: і ў гаспадарцы, і падчас розных абрадаў.

Напрыклад, на вяселле: і свякрусе падарыць, і на печ пакласці, і ў чырвоны кут, і на венік павязаць, і хатняй жывёле на рогі, каб усе і ўсё ў новай хаце спрыяла маладой гаспадыні. І сватам "ногі спутаць", каб моцна не закружылі ў танцы.

Цудоўныя вышываныя ручнікі "народнага майстра Беларусі" Вольгі Сцепановіч з Нясвіжскага раёна адзначаны журы за традыцыйнасць. Майстрыха адна з нямногіх дэманстравала найбольш характэрныя для беларускай вышыўкі вырабы з ромба-геаметрычным арнаментам.

Яшчэ адзін сямейны калектыў заслужыў выдатныя адзнакі: Наталля Лукашык і яе дачка Валерыя з Валожынскага раёна.

Гаспадары свята - уздзенцы - таксама выдатна паказалі сваё майстэрства. Большасць удзельнікаў прадстаўляла народная студыя "Скарбніца" Хатлянскага СДК. Гэты калектыў мае доўгую гісторыю. У яго фондах захоўваюцца матэрыялы вядомай даследчыцы традыцыйных паясоў Веры Селівончык. Маладыя студыйцы Андрон Дар’я і Калеснікава Ксенія працягваюць традыцыі сваіх продкаў.

Прадугледжана на конкурсе намінацыя для лепшага настаўніка "За арганізацыю пераемнасці традыцый народнага мастацтва". У гэтай намінацыі лаўрэатам стала Ірына Валатовіч з Салігорскага раёна.

Не засталася без увагі і самая маладая ўдзельніца свята Настасся Касарыцкая (2008 г.н.). Падчас конкурса яна вышыла прыгожую сурвэтку.

Нягледзячы на прагноз, надвор’е цудоўным вобразам спрыяла майстрам. Як адзначыў старшыня журы, вядомы даследчык традыцыйнага мастацтва, прафесар, доктар мастацтвазнаўства Яўген Сахута, IV рэгіянальнае свята-конкурс вышыўкі і ткацтва пояса "Умельцы" паказала шмат перспектыў развіцця гэтых жанраў народнай творчасці.

На заканчэнне ён пажадаў майстрам плёну і як мага больш добрых вучняў-пераемнікаў.

http://cultur.by/articles/umelcy-minshchyny

## *Удзельнікі IV рэгіянальнага свята-конкурсу майстроў вышыўкі і пляцення паясоў “УМЕЛЬЦЫ”*

**БАРЫСАЎСКІ РАЁН**

- Мароз Тамара Пятроўна (вышыўка)
- Дворнік Тамара Міхайлаўна (вышыўка)
- Календа Вера Александраўна (ткацтва пояса на дошчачках)

**БЯРЭЗІНСКІ РАЁН**

- Аўсянская Валянціна Аляксандраўна (вышыўка)
- Ждановіч Ганна Аляксандраўна (ткацтва паясоў)
- Рэва Ларыса Віктараўна (ткацтва паясоў)
- Альшэўская Тамара Сяргееўна (вышыўка)
- Курневіч Эма Іосіфаўна (вышыўка)
- Літвіненка Надзея Мартынаўна (вышыўка)
- Цісецкая Аксана Мікалаеўна (ткацтва пояса)
- Карканіца Кацярына Уладзіміраўна (ткацтва пояса)
- Мамановіч Вольга Леанідаўна (вышыўка)
- Крыварот Тамара Ігнацьеўна (ткацтва пояса)

**ВАЛОЖЫНСКІ РАЁН**

- Хаванская Наталля Феліксаўна (пляценне паясоў)
- Шумская Марыя Івнауна (вышыўка)
- Лукашык Наталля Аляксееўна (ткацтва паясоў на дошчачках)
- Лукашык Валерыя (ткацтва паясоў на дошчачках)
- Лукашык Кірыл (ткацтва паясоў на дошчачках)
- Карповіч Кацярына (ткацтва пояса “на ніту”)
- Зошчык Марына (ткацтва пояса “на ніту”)
- Зянько Людміла (ткацтва пояса “на ніту”)
- Абрамчык Настасся (ткацтва пояса “на ніту”)
- Лямбовіч Хрысціна Станіславовна (ткацтва пояса “на ніту”)

**ВІЛЕЙСКІ РАЁН**

- Дубяга Аксана Аляксандраўна (ткацтва пояса)

**КЛЕЦКІ РАЁН**

- Дудко Надзея Вячаславаўна (пляценне пояса на “ніту”)
- Кароль Маргарыта Аляксандраўна (пляценне пояса на дошчачках)
- Табачынская Віталія Анатольеўна (пляценне пояса на дошчачках)
- Шумейка Марыя Аляксееўна (пляценне пояса на дошчачках)
- Вастрова Маргарыта Віктараўна (вышыўка)
- Гінюк Марыя Аляксандраўна (вышыўка крыжыкам)
- Кадзевіч Ала Валянцінаўна (пляценне паясоў)
- Кулік Таццяна Мікалаеўна (вышыўка)

**ЛЮБАНСКІ РАЁН**

- Касарыцкая Анастасія (вышыўка)
- Сівіцкая Галіна Мікалаеўна (вышыўка)
- Адзінец Святлана Віктараўна (ткацтва пояса на бердзечку)
- Аксёнчык Тамара Ціханаўна (ткацтва пояса на бердзечку)
- Яскевіч Ірына Васільеўна (пляценне паясоў на станку)
- Чуган Вера Антонаўна (вышыўка)
- Рубчэня Раіса Пятроўна (вышыўка)
- Вакульчык Марына Ўладзіміраўна (вышыўка)
- Касарыцкая Юлія Тарасаўна (вышыўка)
- Скуратовіч Елізавета (вышыўка)
- Пекар Дар’я Сяргееўна (ткацтва пояса на дошчачках)
- Пузевіч Марына Васільеўна (ткацтва пояса на дошчачках)
- Курчына Наталля Сяргееўна (ткацтва пояса рукамі)
- Крукоўская Наталля Васільеўна (ткацтва пояса на бердзечку)
- Каткова Надзея Іванаўна (ткацтва пояса на бердзечку)

**НЯСВІЖСКІ РАЁН**

- Мокат Алена Георгеўна (ткацтва пояса)
- Богуш Наталля Сцяпанаўна (ткацтва пояса)
- Сцепановіч Вольга Ўладзіміраўна (вышывка)

**САЛІГОРСКІ РАЁН**

- Кацяк Ала Анатольеўна (вышыўка)
- Валатовіч Марыя Іванаўна (пляценне паясоў на бярдзечку)
- Хаміцэвіч Вольга Фёдараўна (пляценне пояса на дошчачках)
- Бародка Наталля Мікалаеўна (ткацтва пояса “на ніту”)
- Ілюшчыц Вікторыя(ткацтва пояса “на ніту”)
- Цяляк Валянціна Яфімаўна (ткацтва пояса “на ніту”)
- Валатовіч Ірына Мікалаеўна (ткацтва пояса “на ніту”)

**СЛУЦКІ РАЁН**

- Барынь Наталля Аркадзьеўна (пляценне паясоў на бердзечку)
- Пісарык Іна Віктараўна (пляценне паясоў на дошчачках)
- Каваленка Вольга (пляценне пояса на дошчачках)
- Простак Дана (пляценне пояса на пальцах, пляценне паясоў на бердзечку)
- Петравец Яна (пляценне пояса на пальцах, пляценне паясоў на бердзечку)
- Матусевіч Наталля Казіміраўна (пляценне паясоў на бердзечку)

## СТАРАДАРОЖСКІ РАЁН

- Сацура Марына Анатольеўна (вышыўка)
- Чэчуха Вольга Васільеўна (вышыўка)
- Гаргун Людміла Нікалаўна (ткацтва пояса на бердзечку)
- Лагун Надзея Іванўна (вышыўка)
- Міхеева Святлана Іванаўна (вышыўка)
- Праташчык Зоя Макараўна (вышыўка)
- Спадар Валянціна Леанідаўна (ткацтва пояса на бердзечку)
- Шэстак Вольга Мікалаеўна (ткацтва пояса на бердзечку)
- Семянчэня Ларыса Адасьеўна (ткацтва пояса на бердзечку)
- Дзенісевіч Ніна Мікалаеўна (ткацтва пояса на бердзечку)
- Буравцова Галіна Рыгораўна (ткацтва пояса)

## СТАЎБЦОЎСКІ РАЁН

- Дошчачка Галіна Эдуардаўна (вышыўка)
- Дрозд Інна Іванаўна (вышыўка)
- Халявінская Аліна Антонаўна (вышыўка)

## ЧЭРВЕНЬСКІ РАЁН

- Фабінюк Ірына Паўлаўна (вышыўка)
- Савонава Таццяна Георгеўна (ткацтва пояса на дошчачках)
- Маркушэўская Ірына Антонаўна (пляценне паясоў на пальцах)

## УЗДЗЕНСКІ РАЁН

- Валуева Любоў Сцяпанаўна (вышыўка)
- Ярмак Ірына Анатольеўна (вышыўка)
- Гільміярава Ала Іванаўна (вышыўка)
- Мануілава Тамара Фёдараўна (вышыўка)
- Трус Валянціна Шамратаўна (вышыўка)
- Шчэрбач Святлана Анатольеўна (вышыўка)
- Калеснікава Ксенія (ткацтва пояса на дошчачках)
- Андрон Дар’я (ткацтва пояса на бердзечку)
- Курэйчык Людміла Аляксандраўна (ткацтва пояса на станку)

## ЖУРЫ СВЯТА-КОНКУРСУ

- Сахута Яўген Міхайлавіч - старшыня Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці
- Рудніцкая Галіна Рэмаўна – член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці
- Хачкова Вольга Барысаўна – галоўны спецыяліст па промыслам і рамествам Мінскага абласнога Цэнтра народнай творчасці
- Кандраценя Марыя Рыгораўна – галоўны мастак Мінскага абласнога Цэнтра народнай творчасці
- Аўтушкова Святлана Аляксандаўна – метадыст Уздзенскага РЦК

## АРГКАМІТЭТ СВЯТА-КОНКУРСУ

- Каспяровіч Віталь Адамавіч - загадчык аддзела традыцыйнага мастацтва Мінскага абласнога Цэнтра народнай творчасці
- Макаронак Дзіяна Аляксандраўна – вядучы спецыяліст аддзела культуры Уздзенскага райвыканкама
- Малашэвіч Алена Барысаўна - дырэктар Узденскага РЦК
- Каламіец Алег Мікалаевіч - загадчык метадычнага аддзела РЦК
- Шчэрбач Святлана Анатольеўна – кіраўнік “народнага” клуба майстроў “Сузор’е” Уздзенскага РЦК

АДДЗЕЛ КУЛЬТУРЫ
УЗДЗЕНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА
РАЁННЫ ЦЭНТР КУЛЬТУРЫ

# ДАВЕДНІК

## IV рэгіянальнага свята-конкурсу майстроў вышыўкі і пляцення паясоў “Умельцы”

г. Узда
29 чэрвеня 2013 г.